# тэма: СТАРАБЕЛАРУСКАЯ ПАЛЕМІЧНАЯ ЛІТАРАТУРА

**Актыўны ўдзел у *палеміцы* XVI – XVII стст. прынялі і *абаронцы праваслаўя*.**

**Праваслаўны кірунак палемічнай думкі прадстаўлены творамі:**

- **Мялецiя Сматрыцкага ("Трэнас");**
- **Афанасія Філіповіча ("Дыярыуш")**

# Мялецій Сматрыцкі



- **Гады жыцця:**
  **1577 -1633;**
- **Сапраўднае імя –**
  **Максім Герасімавіч Сматрыцкі;**
- **Месца нараджэння:**
  **мястэчка Смотрыч (сучасная Украіна)**
- **Пісьменнік, філосаф, лінгвіст, грамадска-палітычны і царкоўны дзеяч эпохі Барока.**

# Дасягненні

**Сматрыцкі пакінуў надзвычай багатую літаратурную і навуковую спадчыну.**

- **з’яўляецца аўтарам шматлікіх празаічных, вершаваных і філасофска-публіцыстычных твораў на:**
- **беларускай,**
- **польскай і**
- **лацінскай мовах.**

# Асноўныя біяграфічныя звесткі

- **Пачатковую адукацыю Мялецій атрымаў у Астрожскай школе** (яго бацька, Герасім Смятрыцкі, быў яе першым рэктарам).
- **Затым вучыўся ў Віленскай езуіцкай акадэміі (**філасофскі факультэт**).**
- **Пазней у Ляйпцыгскім і Вітэнбергскім універсітэтах (**атрымаў ступень доктара медыцыны).
- **Нейкі час служыў настаўнікам пры двары князёў Саламярэцкіх.**

# Асноўныя біяграфічныя звесткі

- **У 1617 годзе пастрыгся ў манахі пад імем Мялеція.**
- **Выкладаў у школе Віленскага Святадухаўскага брацтва** (вынікам навуковай працы і педагагічнай практыкі стала *«Граматыка славенская…»*, 1619 г.).
- **З 1620 года – архіепіскап полацкі, епіскап віцебскі і мсціслаўскі.**

# Асноўныя біяграфічныя звесткі

- У 1623 г. пакідае Вільню і накіроўваецца на Блізкі Усход (прычына – абвінавачванне ў смерці Іясафата Кунцэвіча).
- Вяртаецца з падарожжа ў 1627 г. і тайна пераходзіць ва ўніяцтва.
- 1628-1633 гг. безвыезна правёў у Дзерманскім манастыры, што на Валыні, дзе і памёр.

# Агляд творчасці

**У жыцці і творчасці М. Смартрыцкага вылучаюць *два перыяды*:**

- ***першы* – да 1626 года, калі Сматрыцкі выступаў як *абаронца праваслаўя*;**
- ***другі* – з 1627 года, калі ён спярша *тайна*, а з 1628 года *адкрыта* перайшоў на бок *уніятаў*.**

# Праваслаўны перыяд творчасці

- **Першым друкаваным творам пісьменніка-палеміста, які дайшоў да нашага часу, быў «Антыграфі» (1608)** — твор, накіраваны супраць кніг уніяцкага мітрапаліта Іпація Пацея «Ерасі» і «Гармонія» (1608), у якіх не толькі закраналіся пытанні рэлігійнай дагматыкі, але і падымаліся праблемы дзяржаўна-палітычнага характару.

# Праваслаўны перыяд творчасці

- Найбольш значны твор М. Сматрыцкага «Трэнас» («Плач»).
- Выйшаў у 1610 г. у Вільні
- на польскай мове
- пад псеўданімам Тэафіл Арталог (*Багалюб Праўдаслоў*).
- Кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт III загадаў «Трэнас» спаліць, а аўтара і выдаўца кнігі пасадзіць у турму.

# Праваслаўны перыяд творчасці: “Трэнас”

- **Дзякуючы паэтычнаму таленту Сматрыцкага, літаратурныя плачы вылучыліся ў самастойны жанр і занялі выбітнае месца ў беларускай і ўкраінскай літаратурах эпохі Барока**
- **Пачынаецца «Трэнас» *паводле тагачаснай традыцыі,* эпіграмай на герб дому Вішнявецкіх, у якой выкарыстоўваецца барочная метафарычная сімволіка.**

# Праваслаўны перыяд творчасці: “Трэнас”

## СТРУКТУРА твора:

- дзве прадмовы,
- дзесяць раздзелаў.
- Іх падзяляюць на тры ідэйна-тэматычныя групы:
- два пачатковыя раздзелы найбольш ярка раскрываюць талент палеміста-мастака;
- трэці і чацвёрты раздзелы ўяўляюць сабою своеасаблівую энцыклапедыю выказванняў старажытных багасловаў і філосафаў пра кіруючую ролю рымскага папы.
- Шэсць апошніх вырашаюць праблемы рэлігійна-дагматычнага характару.

# Праваслаўны перыяд творчасці: “Трэнас”

- **Першыя <u>два</u> раздзелы сведчаць аб дасканалым валоданнем Сматрыцкім паэтыкай стылю барока.**
- **Апісваючы стан праваслаўнай царквы, Мялецій выкарыстоўваў народна-паэтычную, міфалагічную і біблейскую сімволіку:**
- **«*Рукі мае ў аковах, ярмо на шыі, путы на нагах, ланцугі на клубах, меч з двух бакоў востры над галавою, вада пад нагамі глыбокая, няўгасны агонь па баках, адусюль стогны і енкі, адусюль страх і праследаванні*»**

# Праваслаўны перыяд творчасці: “Трэнас”

- Сматрыцкі дае знішчальную характарыстыку пастырам, якія сваімі ўчынкамі не апраўдвалі прызванне настаўніка:
- *«У жыцці вы карчмары і купцы, у звычаях лежабокі, у размове невукі, а ў абыходжанні лісы крывадушныя, а ў адзенні драпежныя ваўкі... Мудрасць ваша, уменне, размова бязглуздыя, марныя і распусныя і весялосць непрыстойная, у якой і вы самі гінеце, і тыя, хто вас пераймае і ідзе за вамі».*
- Аўтар паказаў сябе добрым знаўцам гуманістычнай літаратуры Заходняй Еўропы. У «Трэнасе» шырока цытуюцца творы Пятраркі, Мантуана, Іахіма Флорскага, Бярнарда Клервоскага і многіх іншых.
- Усяго ў «Трэнасе» аўтар спасылаецца на сачыненні 143 аўтараў.

# Праваслаўны перыяд творчасці: "Трэнас"

- **Паэтыка стылю барока вымагала стракатага спалучэння нябеснага і зямнога, высокага і нізкага, дзівоснага і звычайнага.**
- **Таму ў тэксце нярэдка <u>мінорнае</u> гучанне рэзка пераходзіла ў <u>мажорнае</u>, адсюль суседства, суіснаванне элегічных пачаткаў (*суму, задуменнасці*) з сатырай, іроніяй, гратэскам.**

# Праваслаўны перыяд творчасці: “Граматыка”



- **Вынікам навуковай працы і педагагічнай практыкі стала *«Грамматики славенския правилное Синтагма...»***
- **выдадзена ў 1619 г.**
- **у Еўі, што каля Вільні (цяпер Вевіс, Літва).**

# Праваслаўны перыяд творчасці: “Граматыка”

- **У канцы XVI — першай палове XVII ст. на тэрыторыі Беларусі і Украіны былі шырока вядомы граматыкі, выдадзеныя львоўскімі братчыкамі ў 1591 г., граматыка старагрэчаскай мовы «Адельфотес» і «Граматика словенска» (1596) Л. Зізанія, на якія ў пэўнай ступені абапіраўся Смятрыцкі пры стварэнні сваёй фундаментальнай працы.**
- **Аднак ён змог не толькі ўдасканаліць дасягнутае, але і значна развіць многія палажэнні, сістэматызаваць і больш дакладна акрэсліць граматычную тэрміналогію.**

# Праваслаўны перыяд творчасці: “Граматыка”

- **Больш за два стагоддзі <u>«Граматыка» Сматрыцкага</u> была самым аўтарытэтным падручнікам па славянскім мовазнаўстве.**
- **Да ўсяго гэты падручнік быў узорам для стварэння <u>сербскай, харвацкай, румынскай і балгарскай</u> граматык.**

# Праваслаўны перыяд творчасці: “Граматыка”


СКЛОНЕНЇЕ

Множественнагѡ числа

Числа єдинственнагѡ

► Сматрыцкі ўпершыню ў гісторыі славянскай мовазнаўчай навукі даў поўны курс граматыкі (што *«есть известное художество благо глаголати и писати учащее»)* у яе тагачасных асноўных частках – арфаграфіі, этымалогіі, сінтаксісе і прасодыі.

# Уніяцкі перыяд творчасці

**У гэты перыяд Смятрыцкім былі напісаны такія творы як:**

- “Апалогія” 1628 г.,
- “Пратэстацыя” 1628 г.,
- “Паранезіс” 1629 г.,
- “Экзатэзіс” 1629 г.

# Уніяцкі перыяд творчасці

- У “**Апалогіі**” Сматрыцкі не толькі ***адракаўся*** ад сваіх праваслаўных твораў, ідэй, але і ***асуджаў*** дзейнасць
- Стафана Зізанія,
- Хрыстафора Філалета,
- Клірыка Астрожскага
- і іншых праваслаўных пісьменнікаў-палемістаў.

# Уніяцкі перыяд творчасці

- Некаторыя з уніяцкіх твораў Сматрыцкага напісаны на высокім мастацкім узроўні.
- Многія сцверджанні Сматрыцкага былі справядлівыя і актуальныя.
- Так, ён указваў на коснасць і непаваротлівасць праваслаўнага духавенства, усёй праваслаўнай царквы, якая не ўлічвае павеваў часу, з'яўлення ў жыцці грамадства новага, прагрэсіўнага.
- Гэта тычылася мовы набажэнства:
- праваслаўная царква ўсё яшчэ чаплялася за царкоўнаславянскую мову, якую к гэтаму часу мала хто разумеў;
- уніяты ж арыентаваліся на жывую народную мову насельніцтва.

# Афанасій ФІЛІПОВІЧ



- Неардынарная асоба,
- унікальны майстар мастацкага слова,
- чалавек рэдкага пісьменніцкага таленту,
- грамадска-рэлігійны дзеяч перш. пал. XVII ст.

# Кароткія біяграфічныя звесткі



- **Гады жыцця:**
  **1597 -1648;**
- **Сапраўднае імя – невядома;**
- **Месца нараджэння: Берасцейшчына;**
- **Паходзіў:**
  **з сям'і рамесніка (не адзіная версія).**

# Кароткія біяграфічныя звесткі

- Здабыў добрую адукацыю *(ведаў патрыстыку, творы заходнееўрапейскіх гісторыкаў, вольна карыстаўся старабеларускай, польскай, стараславянскай, лацінскай і грэчаскай мовамі),* дзе канкрэтна, невядома.
- Каля 1620 г. служыў пры двары канцлера Льва Сапегі, дзе навучаў «маскоўскага царэвіча» Яна Фаўстына Лубу.
- У 1627 г. А. Філіповіч пастрыгся ў манахі Віленскага Святадухаўскага манастыра.
- З 1633 г. ён займаў духоўную пасаду намесніка ігумена Дубойскага манастыра (блізу Пінска).

# Кароткія біяграфічныя звесткі

- У 1636 г., пасля перадачы Дубойскага манастыра езуітам, пераходзіць у Купяціцкі манастыр.
- Восенню 1637 г. адпраўляецца ў Маскву з мэтай атрымання аўдыенцыі ў цара Аляксея Фёдаравіча.
- Падарожжа ў Маскву падрабязна занатаваў у «Дыярыушы…».
- У 1640 г. А. Філіповіча абіраюць ігуменам Берасцейскага Сімяонаўскага манастыра, што дало яму пэўны статус, права весці змаганне за ўмацаванне Праваслаўнай Царквы.

# Кароткія біяграфічныя звесткі

- Філіповіч неаднаразова спрабуе выступіць на Вальных Соймах, але ягоныя скрайнія паводзіны і экстраардынарныя спосабы прыцягнення ўвагі да праблемаў праваслаўнай канфесіі выклікаюць абурэнне шляхты.
- У выніку ён неаднаразова трапляе за краты, а затым — у высылку ў Кіеў пад нагляд мітрапаліта Пятра Магілы, адкуль вярнуўся ў Берасце ў 1647 г.
- У 1648 г. па абвінавачанні ў супрацоўніцтве з Б. Хмяльніцкім (нібыта пасылаў яму «нейкія лісты і порах») Філіповіч быў растраляны.

# “Дыярыуш...”

- З творчай спадчыны А. Філіповіча да нашага часу дайшоў **«Дыярыуш, або Апісанне праўдзівых падзей»**.
- Гэта не адзін твор, а збор твораў пісьменніка, аб’яднаных агульнай назвай.
- Першай у зборніку змешчана **«Гісторыя маскоўская пра абраз Прасвятой Багародзіцы»**, ў жанравых адносінах гэта цалкам эпічны твор.
- Другі найважнейшы твор — **«Навіны, або Супліка да караля і Сената на сойме 1645 года»** — утрымлівае эпічныя і публіцыстычныя кампаненты.

# “Дыярыуш...”

- **Астатнія творы, сярод якіх: «Супліка да караля і Сената на Варшаўскім сойме 1643 года», «Парада побажная, імем Ісуса Хрыста, адкупіцеля нашага, каралю польскаму Уладзіславу Чацвёртаму, пану, пану мне міласціваму», «Прыгатаванне на суд», «Прычыны ўчынку майго ў царкве святой Кіева-Пячорскай Цудатворнай на ўсталяванне ганаровага крыжа, 1646 года» — пераважна публіцыстычныя паводле *зместу* і *характару* выкладу матэрыялу.**
- **Кожны з твораў цалкам самастойны ў жанравых і мастацка-кампазіцыйных адносінах.**

# “Дыярыуш...”

- Найбольш ярка літаратурны талент А.Філіповіча як *пісьменніка-эпіка* выявіўся ў «Гісторыі маскоўскай пра абраз Прасвятой Багародзіцы».
- Яна напісана ўвесну 1638 г., падчас знаходжання аўтара ў Маскве, аб чым ён пазней паведаміў у «Навінах».
- Заданне: гэтую частку “Дыярыуша” прачытаць і занатаваць у чыт.дзённік.

# “Дыярыуш...”

**Цытата:**

*"Царква тая спачатку збудована была радаю праваслаўных сялян, калі над вёскай з’явіўся абраз Прачыстай Багародзіцы ў хросным знаку. Па спаленні яе татарамі зноў была ўзведзеная на тым самым месцы, дзе ў вогненным полымі праваслаўныя людзі ўбачылі той жа абраз.”*

# “Дыярыуш…”

- Творчая спадчына Філіповіча мае вялікую мастацкую каштоўнасць у аспекце *вобразатворчасці*.
- Ён стварыў *каларытныя вобразы* вядомых дзяржаўных і царкоўных дзеячаў таго часу, *прапанаваў новую мастацкую канцэпцыю чалавека*.
- Эпічныя творы Філіповіча *адкрыта аўтабіяграфічныя*, галоўны герой іх — сам аўтар.

# "Дыярыуш..."

- Сярод персанажаў твораў Філіповіча — *<u>рэальныя гістарычныя асобы</u>*:
- святары, урадоўцы, шляхта — І. Пацей, Л.Сапега, М. Сматрыцкі, К. Саковіч, Л.Карповіч, Я. Бабрыковіч, М. Крапіўніцкі, Л. Дрэвінскі, П. Магіла, С. Косаў,
- манархі — Жыгімонт III, Уладзіслаў IV.
- У творах пісьменніка з'яўляюцца безыменныя героі — Нявеста, Маладзіца, Старац, Хворы.

# “Дыярыуш...”

- Найбольш каларытна аўтар падае вобраз уніяцкага мітрапаліта І. Пацея.
- Ён паўстае як карыслівая і здрадлівая асоба *(дзеля ўласнай кар’еры выйшаў з падпарадкавання канстанцінопальскім патрыярхам).*
- І.Пацей жорстка пераследуе праваслаўных — *«лупіць, тузае, скрабе, рознымі спосабамі мардуе»,* закрывае, нішчыць і руйнуе бажніцы, забараняе набажэнствы, пераследуе тых, хто выяўляе нязгоду і самастойнасць думкі.
- І. Пацей малюецца як найвялікшы інтрыган, які ўпотай праводзіць у жыццё свае няправідныя задумы.

# “Дыярыуш...”

- Аўтар шырока выкарыстоўваў класічны шлях раскрыцця персанажаў — праз іхныя ўчынкі.
- Адным з першых у беларускай літаратуры Філіповіч ужыў прыгодніцкі спосаб абмалёўкі персанажа (рысы героя раскрываюцца ў надзвычайных, неверагодна складаных сітуацыях).
- Найбольш выразная праява дэтэктыўна-прыгодніцкіх элементаў — містычныя эпізоды.

# “Дыярыуш...”

- У эпічных творах Філіповіча змяшчэнне акцэнта ад падзейнасці і сюжэтнага дынамізму ў бок *псіхалагізму* адбываецца з дапамогай *маналогаў*.
- Яны сведчаць:
- пра павышаную ўвагу пісьменніка да чалавека, яго ўнутранага самавыяўлення.
- *Паводле зместу* — гэта аўтарскія *малітвы*.
- Прамаўляюцца яны ў момант адчаю.

# “Дыярыуш...”

Выключную ролю для ўвасаблення аўтарскай задумы і раскрыцця пакутаў героя адыгрывалі *дыялогі*.

- Дыялагічная форма дазваляла аўтару асвятліць *рысы характару* героя, яго *светаразуменне*, *шкалу каштоўнасцяў*, *валявыя якасці*, *прынцыпы дачыненнняў з зямнымі і нябеснымі сіламі*.

- Філіповіч адным з першых у беларускай літаратуры скарыстаў для раскрыцця характару *пейзаж*.

# “Дыярыуш...”

- Асаблівае месца ў творах пісьменніка займаюць сцэны *цудаў* (іх звыш пяці).
- Паводле семантыка-тыпалагічнага крытэрыя яны распадаюцца на **тры віды**:
- цудадзейны голас, прамоўлены абразом Божай Маці да героя;
- з’яўленне прывіда і яго дапамога герою;
- цуд, які чыніць непасрэдна персанаж з дапамогай нябесных сіл.

- У творчым метадзе А. Філіповіча ключавую ролю адыгрывала *прасторава-часавая* **складовая**. Час і прастора ў яго творах — галоўныя ўнутраныя **рухавікі сюжэта.**

# “Дыярыуш...”

- Творы А. Філіповіча багатыя на 1) *метафары* (метафара «балота» выкарыстоўвалася як сімвал бруду, страчанага сумлення, адступлення ад маральных прынцыпаў).
- А. Філіповіч выкарыстоўваў 2) *параўнанні* (параўноўваў свае шырокія прававыя паўнамоцтвы як дэпутата сойма, з удачай іграка, якому трапілі добрыя карты).
- Пісьменнік звяртаўся да 3) *алегорыі*, калі распавядаў пра ўласныя цяжкія пакуты, якія ён трываў за свае перакананні.
- Выкарыстоўваў у творчасці багаты фонд беларускіх народных *прымавак, прыказак, выслоўяў.*

# “Дыярыуш...”

- Заслуга Філіповіча як мысліцеля і грамадска-царкоўнага дзеяча ў тым, што ён выказаў ***рэзкі пратэст супраць паланізацыі*** і ***акаталічвання*** беларускага праваслаўнага насельніцтва.
- У свядомасці А. Філіповіча ***паняцці веры і радзімы атаясамліваліся***, таму змаганне за незалежнасць Бацькаўшчыны праявілася ў ягонай творчасці ў выглядзе абароны Праваслаўя.

# "Дыярыуш..."

- А. Філіповіч заклікаў да спакою ў гаспадарстве, міру паміж рознымі станамі.
- Крытыкаваў дзейнасць урадоўцаў і ў першую чаргу манархаў, якія не стварылі спрыяльных умоваў для мірнага суіснавання вернікаў розных канфесіяў.
- Найлепшай формай кіравання ён назваў абсалютную, спадчынную манархію.
- На старонках яго твораў прагучалі гуманістычныя ідэі.
- Матыў абароны чалавечай годнасці, свабоды сумлення, правоў чалавека праходзіць праз усю творчасць пісьменніка.

# У заключэнне

- Берасцейскі Сімяонаўскі манастыр



- **Афанасій – адзін са святых апекуноў Беларусі.**
- **Свята ў гонар Афанасія адзначаецца Праваслаўнай царквой двойчы: 5 верасня (у гонар смерці) і 20 ліпеня (у дзень знаходжання мошчаў).**
- **Апошнія перыяд жыцця пісьменніка занатаваныя ў «Аповесці пра пакуты і смерць айца Афанасія Філіповіча», створанай невядомым берасцейскім манахам.**

# У заключэнне

- Асоба Філіповіча складаная і неадназначная, зрэшты, як і яе ацэнкі.
- Яго ацэньвалі па-рознаму, называючы:
- то святым,
- то змагаром супраць Берасцейскай царкоўнай уніі,
- то вар'ятам,
- то агентам Маскоўскай дзяржавы і здраднікам.